Аксана КОЎРЫК,
кандыдат мастацтвазнаўства

# ТРАДЫЦЫЙНЫ БЕЛАРУСКІ КАСЦЮМ І ЯГО ЭЛЕМЕНТЫ Ў СУЧАСНАЙ САЦЫЯКУЛЬТУРНАЙ ПРАСТОРЫ

УДК 391(=161.3)

У артыкуле ў параўнальна-стылістычным і семіятычным плане разглядаюцца роля і значэнне касцюма ў традыцыйным сялянскім грамадстве і ў сацыякультурнай прасторы сучаснай Беларусі, сістэма яго міфапаэтычных сімвалаў і значэнняў, адлюстраванне ў ім розных аспектаў функцыянавання грамадства, асобныя напрамкі яго развіцця ў творчасці сучасных айчынных фэшн-дызайнераў.

Ключавыя словы: *касцюм, традыцыйны строй, традыцыйная культура, масавая культура, семіётыка касцюма.*

In the article in comparative stylistic and semiotic aspects the question of the role and importance of the costume in the traditional peasant society and in the socio-cultural space of modern Belarus, the system of its mythopoetic symbols and meanings, the reflection of different aspects of society functioning, the separate directions of its development in the work of modern Belarusian fashion-designers is considered.

У строгім сэнсе традыцыйны беларускі касцюм (сялянскі) сёння стаў з’явай гістарычнай, аб’ектам музейнага калекцыянавання. Да нядаўняга часу толькі музеі, спецыялісты дамоў рамёстваў, удзельнікі фальклорных калектываў у розных рэгіёнах нашай краіны ды асобныя калекцыянеры захоўвалі даследчы інтарэс да названай часткі нацыянальнай спадчыны. Але апошнім часам гэты інтарэс адрадзіўся. Зацікавіліся традыцыйным народным строем і спецыялісты ад індустрыі сусветнай моды. Так, у 2015 г. у Мілане на Тыдні высокай моды гледачы ўбачылі калекцыю (вясна – лета) дызайнераў знакамітай маркі Valentino Марыі Грацыі К’юры і П’ера Паола Пічолі, якія выкарысталі беларускія матывы ⤓. Беларускі “Млын моды” ў адным з паказаў апошніх гадоў прадэманстраваў на подыуме ўзоры аўтэнтычнага беларускага народнага касцюма, нагадаўшы яшчэ раз, што фальклор – невычэрпная крыніца натхнення для сучасных айчынных фэшн-дызайнераў. У пачатку 2023 г. на тэлеканале “Беларусь-3” трансляваўся шматсерыйны дакументальны фільм “Строй”, прысвечаны традыцыйнаму беларускаму касцюму розных рэгіёнаў нашай краіны. Яго аўтары, імкнучыся даступна паказаць гэтую з’яву шырокаму гледачу, звярнуліся да калекцый і спецыялістаў рэгіянальных і сталічных музеяў, запісалі інтэрв’ю з аўтарытэтнымі даследчыкамі, разгледзелі народны касцюм у кантэксце розных навуковых падыходаў.



**Паказ мадэлі з калекцыі “Вясна – лета 2015” моднага дома Valentino. Тыдзень высокай моды ў Парыжы.** Elle. 28.01.2015.

Відавочна, што традыцыйны строй – з’ява нацыянальнай культуры, якая мае вечную каштоўнасць, яе фундаментальная аснова, але ў той жа час і гістарычны феномен з вельмі працяглым перыядам развіцця. Строй быў абумоўлены пэўным укладам жыцця, тыпам гаспадаркі, характэрнымі сацыяльнымі адносінамі, што адлюстраваліся ў ім і сышлі ў нябыт разам з самой тысячагадовай аграрнай цывілізацыяй і патрыярхатным тыпам сямейна-родавых узаемадачыненняў. На працягу XX ст. на змену гэтай цывілізацыі прыйшлі машынная індустрыя, урбанізацыя і сучаснае інфармацыйнае асяроддзе. На пэўны перыяд часу традыцыйны народны касцюм сапраўды страціў актуальнасць, быў забыты, але сёння інтарэс да яго адраджаецца, што сведчыць пра цікавасць людзей да сваіх каранёў і мінулага, пазнанне якога адкрывае дарогу ў паспяховую будучыню.

У рамках артыкула традыцыйны беларускі касцюм разгледжаны ў трох асноўных аспектах: 1) як неад’емная частка і важны складнік інтэр’еру народнага жылля; 2) як увасабленне характэрнай формы светапогляду, міфапаэтычных уяўленняў пра ўладкаванне свету, сістэму традыцыйных культурных каштоўнасцяў і сацыяльных адносін; 3) як крыніца ідэй і натхнення для сучасных дызайнераў у кантэксце актуальных сацыякультурных і цывілізацыйных працэсаў.

Беларускі народны строй вельмі добра даследаваны: ён апісаны ў 26 этнарэгіянальных варыянтах, паказаны ў класічнай манаграфіі М. Раманюка і яго навуковых паслядоўнікаў [1]. Сабраны цудоўныя айчынныя калекцыі (найлепшыя – у Музеі народнага дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва ў Раўбічах – філіяле Нацыянальнага мастацкага музея, а таксама ў Музеі старажытнабеларускай культуры Нацыянальнай акадэміі навук) як нацыянальнага, так і рэгіянальнага ўзроўняў ⤓. Будучы часткай адзінага прадметнага комплексу інтэр’еру на-

роднага жылля, народны касцюм уяўляе сабой збор тэкстыльных вырабаў ручной вытворчасці, выкананых з сыравіны натуральнага паходжання, пераважна з лёну і воўны, у тэхніках ткацтва, шыцця, вышыўкі і пляцення. Традыцыйны строй мае накладны, састаўны, шматслаёвы (2-3 слаі адзення на целе) характар і прызначаны для індывідуальнага выкарыстання. Кожны касцюм унікальны, ён існуе, як правіла, у адзіным экзэмпляры, мае арыгінальную сістэму накладной арнаментальнай дэкарацыі геаметрычнага і расліннага характару.

Традыцыйны сельскі і нават мястэчковы інтэр'ер у Беларусі быў арганізаваны пераважна з вырабаў хатняга тэкстылю. Яго багацце і разнастайнасць – залог дабрабыту і росквіту. Інтэр'ер, створаны жаночымі рукамі, увасабляў ідэальную пластычна-прасторавую мадэль Светабудовы такой, якой яе ўяўляла традыцыйнае міфапаэтычнае мысленне насельнікаў: гарманічнай, трыадзінай (зямля, неба, падземны / водны свет), спарадкаванай і ўраўнаважанай па гарызанталі і вертыкалі, з выразнай іерархіяй цэнтра (дзе знаходзіцца Вялікая багіня / Сусветнае дрэва) адносна перыферыі. Асноўная рыса ўбрання традыцыйнага інтэр'еру – не толькі вялікая колькасць хатняга тэкстылю, але і разнастайнасць асартыменту яго вырабаў, прызначаных для пакрывання паверхняў, так званых семіятычных гарызонтаў: абразоў, сцен, палацяў, падлогі, сталоў, лаваў, іншых прадметаў мэблі. Гэта ручнікі, посцілкі, абрусы, тканыя кілімы, вышытыя і маляваныя дываны, вязаныя або плеценыя дарожкі. Тэкстыльнае пакрыццё, акрамя найперш непасрэднага практычнага прызначэння (служыць уцяпленню дома, змякчаць "трэнне" і кантрасты паверхняў пры іх датыканні да цела, ствараючы ўтульнасць), выконвала задачу семіятычнай сакралізацыі прасторавых зон, аб'ектаў і целаў, якія ім накрываліся.

Асабліва актуальнай гэтая знакава-сімвалічная функцыя тэкстылю станавілася ў рытуальна-абрадавым кантэксце, у прасторы інтэр'еру, спецыяльна арганізаванай да хрэсьбін, вяселля, пахавання, а таксама да святаў царкоўна-каляндарнага, гадавога цыкла. Універсальны характар традыцыйнага інтэр'еру прадугледжваў яго хуткую трансфармацыю, пертварэнне з паўсядзённа-прафаннага ў сакралізаванае святочнае менавіта з дапамогай вырабаў хатняга тэкстылю. Бо менавіта так, праз чаргаванне будняў і святаў, звязаных з рухам каляндарнага года, рэгулярным абнаўленнем прыроды і кругаваротам жыццёвага цыкла чалавека (ад нараджэння да смерці і адраджэння ў нашчадках), рытмічна ўпарадкоўваўся час у міфа-рытуальнай прасторы традыцыйнай культуры. А сам народны абрад, уся сістэма яго рытуальна-сімвалічных дзеянняў, якія мелі апатрапеічны характар, былі накіраваны на ліквідацыю зла і здабыццё дастатку і росквіту для калектыву (роду, сям'і). Багацце і разнастайнасць покрываў сведчыла пра святочны характар задуманага мерапрыемства.

**Сімвалам ⤓ пазначаны матэрыялы, даступныя для спампоўвання і азнаямлення, спасылкі па qr-кодзе.**

Касцюм як завершаны вобраз і шматслаёвае тэкстыльнае покрыва цела чалавека складаў неад'емную частку гэтага багатага комплексу вырабаў. Ён выконваўся часта аднымі і тымі ж рукамі будучай гаспадыні, з тых жа натуральных матэрыялаў, што і ўвесь астатні хатні тэкстыль, быў упрыгожаны ў той жа сістэме арнаментальнай накладной дэкарацыі (вышытай) або быў часткай самой узорнай канструкцыі дэкарацыі (тканай) і ўяўляў у разгорнутым выглядзе, г. зн. надзетым на цела, культурны вобраз свайго носьбіта або носьбіткі як члена традыцыйнай супольнасці, родавай або суседска-тэрытарыяльнай абшчыны. Так, акт апранання нованароджанага быў раўназначны наданню імені, хрышчэнню і знаёмству з грамадой, г. зн. са Светам; пераапрананне нявесты ў працэсе вясельнага рытуалу азначала пераход ад дзяцінства да дарослацці, паўнавартаснага сацыяльнага функцыянавання ў якасці жонкі і маці сямейства, гаспадыні дому; апрананне нябожчыка сведчыла, што ён пакінуў свет жывых і сыходзіць у нябыт.

У знакава-сімвалічнай сістэме каштоўнасцяў традыцыйнай культуры накрыванне нейкага аб'екта (прадмета або цела) азначае акт яго сакралізацыі; ён падразумявае павышэнне семіятычнай каштоўнасці (значнасці) гэтага аб'екта або персанажа, вылучэнне яго на фоне іншых як



**Жаночыя строі сяла Маларыта. Заходняе Палессе.**

галоўнага (важнага) у рамках міфарытуальнага комплексу (пэўная прастора, час і ўзаемадзеянне паміж удзельнікамі). Акт накрывання цела (надзявання касцюма) у сістэме міфарытуальных уяўленняў і сімвалічных дзеянняў супрацьпастаўлены яго раскрыванню, зняццю вопраткі: ён прадугледжвае і сімвалічнае распрананне, г. зн. пазбаўленне каштоўнасці, абясцэньванне (ад сакралізацыі – да трывіялізацыі). Апрананне – працэс апрыёры рытуальны; ён звязваецца з абрадам, са святам, з нейкім сімвалічным пераходам – з падзеямі, што выходзяць за рамкі штодзённасці (прыбіранне нявесты, адзяванне наванароджанага або пераапрананне нябожчыка), і ў залежнасці ад сітуацыі азначае перамену сацыяльнага статусу чалавека, які апранаецца. Такім чынам, чалавек апрануты – ужо сакралізаваны, або асвечаны, ён ужо – член калектыву, з'ява культуры, а не толькі спараджэнне Маці-Прыроды. Шматслойнасць народнага касцюма (2-3 накладныя, прылеглыя да цела слаі) сведчыць пра падвышаную ступень сакралізацыі чалавека як цэнтра рытуалу ў прасторы традыцыйнага святочнага інтэр'еру, упрыгожанага тэкстылем.

Адпаведна прынцыпам падабенства і ўзаемнага адлюстравання, характэрным для перцэпцыйнай магіі, урадлівасць і росквіт прыроды ў сістэме ўяўленняў нашых продкаў непасрэдна звязаны з урадлівасцю і росквітам чалавечага калектыву. Дзякуючы ўстойлівай працягласці існавання гэтых прынцыпаў, якія прадугледжвалі моцную сувязь іх носьбітаў (прадстаўнікоў гэтага калектыўнага тыпу свядомасці) з прыродай, яны і цяпер захоўваюць актуальнасць у свядомасці беларусаў. А асноўнай каштоўнасцю для нашых продкаў былі багацце і разнастайнасць рэсурсаў, дароў прыроды і тое, што ствaралася чалавечымі рукамі. Хто валодае вялікай колькасцю ўсяго гэтага, той больш значны; яго пазіцыя больш трывалая, а рэспектабельнасць, г. зн. разлік на павагу і прызнанне супляменнікаў, больш грунтоўная. Вось чаму так шчодра ўпрыгожвалі народнае жыллё разнастайнымі тэкстыльнымі вырабамі (ручнікамі, посцілкамі, абрусамі), рыхтуючыся да свята, асабліва да галоўнай падзеі ў жыцці чалавека, якой беларусы лічаць вяселле. Бо яно азначае ініцыяцыю, перш за ўсё для жанчыны, яе ўступленне ў фазу росквіту, цвіцення і плоданашэння. Таму і самы багаты, найбольш упрыгожаны, поўны і закончаны варыянт народнага касцюма – менавіта вясельны, жаночы, створаны, як правіла, самой нявестай для сябе. Ён жа – і яе пасмяротнае адзенне ⤓.

Традыцыйны строй (кашуля + спадніца, андарак, панёва / штаны + пояс + фартух + анучы + капялюш / скіндачка, намітка, хустка) уяўляе сабой цэласны, закончаны і завершаны вобраз яго носьбіта (чалавека) як увасабленне ідэальнага вобраза Свету. Яго цялесная мадэль – гэта міфапаэтычная метафара, якая ўвасабляе вобраз поўнага і гарманічнага Быцця. Чалавек у касцюме – нібы сам упрыгожаны Свет, які знаходзіцца ў найвышэйшай кропцы існавання, у зеніце прыгажосці і славы, на піку росквіту жыцця. Нездарма старажытныя грэкі называлі свет Космасам (ад *kostea* 'ўпрыгожаны').

Сам склад традыцыйнага народнага касцюма, які невыпадкова называецца *строй*, адлюстроўвае структуру Светабудовы, ідэальнай міфапаэтычнай мадэлі Быцця. Чалавек у святочным касцюме з пункту гледжання традыцыйнай культуры – гэта заўсёды найлепшая (ідэальная) версія самога сябе, увасабленне ўласнага максімуму, як і адлюстраванне ідэальнай мадэлі Светабудовы. Ён, як цэнтр Свету, як Сусветнае Дрэва, злучае ў сабе верх і ніз, аб'ядноўвае Неба і Зямлю, звязваючы разам (поясам) супрацьлеглыя сферы Быцця; ён нібы прымірае іх у сабе, наладжвае іх узаемадзеянне. Яго галава, упрыгожаная адпаведным галаўным уборам, вянчае Свет, яна накіравана да нябёсаў, ногі, як карані дрэва, моцна ўпіраюцца ў зямлю, а рукі, як галіны, цягнуцца да сонца.

У традыцыйных арнаментальных кампазіцыях беларусаў, якія захавалі найстаражытнейшыя матрыярхатныя карані сваёй язычніцкай культуры, у цэнтры Свету – жанчына як увасабленне Вялікай багіні-маці; яе яшчэ называюць Берагіняй. На яе руках-галінах сядзяць птушкі (дзеці), ёй як цэнтру Свету, той, што дае жыццё, стваральнай, пладаноснай іпастасі пакланяюцца жывёлы. Адна з самых старажытных і найбольш устойлівых (архетыпавая па сутнасці) вобразна-сімвалічная кампазіцыйная мадэль у візуальных мастацтвах – гэта схема Адарацыі, або пакланення богу / багіні капытных жывёл і птушак як увасаблення вечнай гармоніі, дабрабыту і росквіту. Мы часта бачым Берагіню не толькі на вышытых вясельных ручніках, але і на дэталях народнага касцюма, напрыклад на пышных рукавах кашулі, на падоле фартуха. Нявеста ў вясельным строі – гэта таксама метафарычнае ўвасабленне вобраза Вялікай багіні – прамаці чалавецтва і цэнтра Свету.

Традыцыйны касцюм мае дзве асноўныя функцыі: біяадаптыўную і сацыярэпрэзентатыўную; яны адлюстроўваюць дваістую прыроду чалавека – з аднаго боку, істоты біялагічнай, а з другога – сацыяльнай. Першая накіравана на ахову слабага чалавечага цела, на яго "прымірэнне" з суровымі прыродна-кліматычнымі ўмовамі жыцця і зменай каляндарнага цыкла. Другая – на яго вобразна-сімвалічную ідэнтыфікацыю ў якасці члена чалавечай супольнасці

(у патрыярхатнай структуры адносін гэта абшчына, род, сям'я) для забеспячэння прадуктыўных сацыяльных сувязяў і адэкватнага ўзаемадзеяння людзей у чалавечым калектыве.

Літаральным адлюстраваннем такой функцыянальнай дваістасці з'яўляецца характэрная для народнага касцюма сімвалічная нераўназначнасць яго верхняга і споднягa бакоў, якія маюць розную семіятычную каштоўнасць. Так, бок, які "глядзіць" вонкі, павернуты да свету, або парадны, у традыцыйным строі найбольш дэталізаваны, багата арнаментаваны, дэкаратыўна насычаны, старанна структураваны арнаментам і дапоўнены фальбонкамі, стужкамі, тасьмой, брыжамі. А на адваротным баку, прылеглым непасрэдна да цела, хаваюцца дробныя заганы тканіны і хвосцікі ад шыцця. У прадметах адзення, якое захіналася (напрыклад, світках), канструктыўна і кампазіцыйна сіметрычна арганізаваных, такую нераўназначнасць базавых бінарных апазіцый адлюстроўвае падзел на левы і правы ("жаночы" і "мужчынскі") бакі.

Традыцыйны народны касцюм універсальны па характары і ўстойлівы па складзе асноўных элементаў. Яго канструктыўная і кампазіцыйная аснова – накладная льняная кашуля, якая ў мужчынскім і жаночым варыянтах адрозніваецца нязначна, пераважна даўжынёй (жаночая кашуля даўжэйшая за мужчынскую), асобнымі дэталямі (брыжы, плечавыя ўстаўкі, афармленне каўняра), а таксама багаццем аздаблення (жаночы варыянт больш дэкаратыўна насычаны). Кашулю дапаўняюць штаны / андарак (спадніца, сукня, панёва), фартух (для жанчын), пояс, анучы, галаўны ўбор у жаночым і мужчынскім варыянтах. Ужо самі матэрыялы, якія выкарыстоўваліся для вырабу касцюма (лён, воўна, сукно хатняга вырабу), адзіны тып арнаменту (ромбападобны геаметрычны або раслінны), агульны характар яго размяшчэння на вопратцы (па краях, на шыі і на грудзях, на плячах, ля запясця) у цэлым выразна ідэнтыфікавалі "свайго", супрацьпастаўляючы яго "чужым", і ў той жа час тонка нюансавалі ўнутрыродавыя або тэрытарыяльныя адрозненні. У выпадку з адзіным балта-славянскім этнічным субстратам гэта не мела прынцыповага значэння, але набывала вядомы сэнс у адносінах, напрыклад, да татараў або яўрэяў, іншаверцаў, прадстаўнікоў іншых этнічных груп. Хоць у той жа час рэлігійная талерантнасць, палітычныя традыцыі ўладаў і працягласць сумеснага пражывання на адной тэрыторыі з балта-славянамі ўнеслі карэктывы і ў традыцыйны касцюм прадстаўнікоў гэтых усходніх народаў.

*Пераклад з рускай мовы.*

*Заканчэнне будзе.*

**Спіс літаратуры**

1. **Раманюк, М. Ф.** Беларускае народнае адзенне / М. Ф. Раманюк. – Мінск : Беларусь, 1981. – 317 с.
2. **Фрейденберг, О. М.** Семантика первой вещи / О. М. Фрейденберг // Декоративное искусство СССР. – 1976. – № 12. – С. 16–22.
3. **Миронова, Л. Н.** Цветоведение / Л. Н. Миронова. – Минск : Выш. шк., 1984. – 286 с.
4. **Рыбаков, Б. А.** Космогония и мифология земледельцев энеолита / Б. А. Рыбаков // Советская археология. – 1965. – № 1. – С. 24–47; № 2. – С. 13–33.
5. **Рыбаков, Б. А.** Происхождение и семантика ромбического орнамента / Б. А. Рыбаков ; Музей народного искусства и художественных промыслов. – М. : Изобр. иск-во, 1972. – С. 36–54.
6. **Амброз, А. К.** Раннеземледельческий культовый символ ("ромб с крючками") / А. К. Амброз // Советская археология. – 1965. – № 3. – С. 14–27.